***В. І. Саітава,***
*дацэнт Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*кандыдат педагагічных навук*

***І. М. Стрыжонак,***
*дацэнт Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# ЛІЧБАВЫЯ КАЛЕКЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ ЯК СРОДАК ІНФАРМАЦЫЙНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ВЫШЭЙШАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ва ўстановах вышэйшай адукацыі нашай краіны вучэбная дысцыпліна «Гісторыя Беларусі» з'яўляецца нарматыўнай і выкладаецца студэнтам розных спецыяльнасцей і напрамкаў. У ліку вядучых дысцыплін яна вызначана ў навучальным плане спецыяльнасці «Гісторыя».

У 2013 г. была зацверджана эксперыментальная вучэбная праграма «Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі», якая прызначалася для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў рамках модуляў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Вызначальнымі асаблівасцямі дадзенай праграмы ў параўнанні з папярэднімі з'яўляюцца: удасканаленне зместу дысцыпліны, выкарыстанне прафесійнага кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні, значнае павялічэнне ролі і ўдзельнай вагі самастойнай работы студэнтаў, магчымасць выкарыстання сучасных інавацыйных тэхналогій. На вывучэнне інтэграванага модуля «Гісторыя» вылучана ўсяго 72 гадзіны, у тым ліку 34 аўдыторныя гадзіны і 38 гадзін самастойнай працы студэнтаў.

У якасці асноўных мэт сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі, як вызначана ў адукацыйным стандарце «Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін» выступаюць фарміраванне і развіццё сацыяльна-асобасных кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыянальна-каштоўнасным і сацыяльна-творчым вопыце, якія забяспечваюць рашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асобасных задач і функцый. У працэсе падрыхтоўкі выпускнік УВА павінен набыць сацыяльна-асобасныя і акадэмічныя кампетэнцыі, у ліку якіх грамадзянскасць, здольнасць да сацыяльнага ўзаемадзеяння,

крытычнае мысленне, валоданне даследчымі навыкамі, уменне працаваць самастойна і інш.

Для спецыяльнасцей 1-21 03 01 Гісторыя (па напрамках), 1-23 01 13 Гісторыка-архівазнаўства, 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) дысцыпліна «Гісторыя Беларусі» і шматлікія спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны беларусазнаўчага зместу складаюць асноўны кампанент прафесійнага навучання.

Для спецыяльнасцей гістарычнага профіля выкладчыкамі профільных кафедр распрацоўваюцца і выкладаюцца дзясяткі сумежных дысцыплін і аўтарскіх спецкурсаў. Напрыклад, на кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы распрацаваны курсы: «Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі», «Гісторыя культуры Беларусі», «Архівы Вялікага княства Літоўскага і іх лёс», «Канфесіянальная гісторыя Беларусі», «Гістарычная думка і навука ў Беларусі» і інш. На кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка чытаюцца вучэбныя дысцыпліны «Краязнаўства і этналогія Беларусі», «Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі», «Гістарычная геаграфія Беларусі» і інш. На гістарычным факультэце Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна студэнтам выкладаюцца «Гісторыя горада Брэста», «Гісторыя грамадска-палітычнай думкі ў Беларусі» і іншыя дысцыпліны. Ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі ствараюцца адпаведныя профілю спецыяльнасці і яе напрамкам гістарычныя дысцыпліны.

Вялікая колькасць гістарычных дысцыплін беларусазнаўчага зместу распрацоўваецца і для студэнтаў іншых гуманітарных спецыяльнасцей, напрыклад, для студэнтаў ФІДК выкладаюцца раздзелы гісторыі беларускай кнігі («Гісторыя кнігі»), беларускай бібліятэчнай справы і бібліяграфіі («Бібліятэказнаўства. Гісторыя», «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя»), «Гісторыя краязнаўства Беларусі» (ФЗН, спецыялізацыя «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства») і інш.

Студэнцкая моладзь краіны вывучае спецкурс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай выайны».

Пасяховае засваенне вучэбнага матэрыялу па гістарычных дысцыплінах і фарміраванне кампетэнцый залежыць ад шэрагу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фактараў, да ліку вядучых належаць выкарыстанне грунтоўнай інфармацыйна-рэсурснай базы і інавацыйных тэхналогій.

Надзейнай асновай вывучэння айчыннай гісторыі становяцца лічбавыя калекцыі нацыянальных дакументаў, у тым ліку гістарычных першакрыніц, над стварэннем якіх на працягу шэрагу гадоў працуе НББ.

Лічбавыя калекцыі НББ – гэта выдатны здабытак рэалізацыі каштоўнай нацыянальнай дакументальнай спадчыны сродкамі сучасных інфармацыйных тэхналогій. У НББ сфарміравана 16 паўнатэкставых калекцый, сярод якіх «Крыніцы па гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX стст.», «Скарыніяна», «Перыядычны друк Беларусі другой паловы XVIII ст. – 1917», «RADZIVILIANA», «Белавежская пушча», «Кніга Беларусі XVI–XVIII стст.», «Партызанскі і падпольны друк Беларусі», «Знакамітыя імёны і падзеі Беларусі», «Беларусь у вобразах XVIII – пачатку XX стст.», «Кніга Беларусі XIX – пачатку XX стст.», «Бібліятэка Я. Карскага ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі» [1].

Калекцыі фарміруюцца па відавых і тэматыка-храналагічных прыметах. Відавыя калекцыі дазваляюць з вычарпальнай паўнатой адлюстроўваць айчынныя дысертацыі і аўтарэфераты дысертацый, перыядычныя выданні, плакаты, паштоўкі і іншыя дакументы. Тэматычныя калекцыі – найбольш значныя з’явы і падзеі беларускай гісторыі.

Кожная з калекцый прадстаўляе ўнікальныя дакументы, раней цяжка даступныя, рассеяныя па кнігасховішчах Беларусі і замежных краін, крыніцазнаўчая значнасць якіх пацверджана гістарычнай навукай, культуралогіяй і кнігазнаўствам. Забеспячэнне іх даступнасці для адукацыйных і навукова-даследчых мэт з’яўляецца важным дасягненнем НББ. У межах артыкула астановімся толькі на асобных з лічбавых калекцый НББ.

Паўнатэкставая калекцыя «Крыніцы па гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX стст.» ахоплівае рэдкія гістарычныя першакрыніцы: заканадаўчыя дакументы, акты, матэрыялы статыстыкі, хронікі і летапісы, матэрыялы справаводства, мемуарную літаратуру і эпісталярныя крыніцы, картаграфічныя матэрыялы і навуковыя працы па гісторыі Беларусі. Склад гэтых матэрыялаў вялікі і разнастайны, і на сённяшні дзень цалкам завершана частка калекцыі, прысвечаная ўнікальным афіцыйным даведнікам дарэвалюцыйнага перыяду – памятным кніжкам губерняў Расійскай імперыі, якія ахоплівалі беларускія землі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пачынаючы з 2011 г. пачалося выданне асобных DVD-ROM дыскаў, на якіх прадстаўлены копіі поўных камплектаў памятных кніжак Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў [2]. Памятныя кніжкі выдаваліся губернскімі статыстычнымі камітэтамі з сярэдзіны XIX ст. і амаль да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, але ніводная бібліятэка, архіў ці музей у Беларусі не мелі іх поўных камплектаў. У самастойных раздзелах памятных кніжак змешчаны адрас-календары з поўным пералікам губернскіх і павятовых урадавых і грамадскіх устаноў з іх асабістым складам, што паказвае эвалюцыю адміністрацыйна-тэрытарыяльнай і ведамаснай структуры кіравання і зმяненні ў персанальным складзе ўстаноў; даведачныя звесткі аб адміністрацыйным падзеле, усіх прадпрыемствах і ўстановах па галінах эканомікі, спісы населеных пунктаў, землеўласнікаў, медыцынскіх спецыялістаў, святароў розных канфесій, спецыялістаў народнай адукацыі і іншых галін; тэксты дакументаў мясцовых органаў кіравання; статыстычныя агляды са звесткамі па статыстыцы, насельніцтва, землеўласніцтва, сельскай гаспадаркі і іншых галін; гістарычна-краязнаўчы раздзел, у якім змяшчаліся рэгіёназнаўчыя апісанні і даследаванні.

Для зручнага выкарыстання лічбавага масіву да памятных кніжак распрацаваны дапаможны пошукавы апарат – гэта дапаможныя паказальнікі загалоўкаў артыкулаў і гістарычных дакументаў, паказальнікі імёнаў з кароткімі біяграфічнымі звесткамі і ілюстрацый, складзеныя па матэрыялах гісторыка-краязнаўчага зместу. Рубрыкі дапаможных паказальнікаў актыўнымі ссылкамі звязаны з адпаведнымі выпускамі памятных кніжак.

Мульцімедыйныя выданні памятных кніжак дазволілі адлюстраваць унікальны ілюстрацыйны матэрыял: карты, гербы, паштоўкі, малюнкі, партрэтныя і іншыя; праслухаць фрагменты музычных твораў беларускіх кампазітараў XIX ст.: М. К. Агінскага, С. Манюшкі, Н. Орды, М. Ельскага і інш.

Карыстальнікам, якія пачынаюць працаваць з памятнымі кніжкамі, адрасаваны навуковыя артыкулы, уключаныя ў склад кампакт-дыскаў, якія асвятляюць памятныя кніжкі беларускіх губерняў як гісторыка-кніжны феномен і даюць характарыстыку кніжкам кожнай губерні.

Памятныя кніжкі могуць выкарыстоўвацца студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі, выкладчыкамі як каштоўны рэсурс для гістарычных даследаванняў, звязаных з навуковай і вучэбнай дзейнасцю, з самаадукацыяй і аматарствамі гістарычнага характару

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(узнаўленне сямейна-родавай гісторыі і інш.). Змест памятных кніжак забяспечвае практычна любую гістарычна-рэгіянальную тэматыку, а ў сукупнасці апрацоўка пэўных фактаў прынясе плён у вывучэнні грамадска-палітычных, сацыяльна-культурных, эканамічных і іншых працэсаў на беларускіх землях у сярэдзіне XIX – пачатку XX стст.

Газеты, часопісы і іншыя перыядычныя выданні належаць да важнейшых крыніц гістарычных даследаванняў і запатрабаваны з боку ўсіх суб'ектаў навукова-адукацыйнага працэсу. Забеспячэнню захаванасці і даступнасці перыядычных выданняў служыць паўнатэкставая калекцыя «Перыядычны друк Беларусі другой паловы XVIII ст. – 1917» і «Электронны архіў нацыянальнай перыёдыкі», аб'ектам адлюстравання ў якім з'яўляюцца сучасныя газеты, часопісы і выданні інфармацыйных агенцтваў.

У складзе калекцыі «Перыядычны друк Беларусі другой паловы XVIII ст. – 1917» лічбавыя копіі выпускаў газет: «Могилевские губернские ведомости» (перыяд выдання 1838–1918 гг.; адлюстраваны выпускі за 1848–1850, 1902, 1909–1912, 1914–1917 гг.); «Минские губернские ведомости» (перыяд выдання 1838–1917 гг.; адлюстраваны выпускі за 1840–1841, 1844–1850, 1852–1864, 1866, 1884, 1916); «Витебские губернские ведомости» (перыяд выдання 1838–1917 гг.; адлюстраваны выпускі за 1848–1851, 1853–1856, 1858–1863 гг.); «Полоцкие епархиальные ведомости» (*выдаваліся 1874–1917 гг.;* адлюстраваны выпускі за 1874–1881, 1883–1917 гг.); «Минские епархиальные ведомости» (адлюстраваны за 1868–1917 гг., прадстаўлены таксама храналагічны і сістэматычны паказальнікі артыкулаў за 1868–1897 гг., складзеныя святаром І. Пастарнацкім); «Гродненские епархиальные ведомости» (адлюстраваны за 1901–1910 гг.). У гэтых газетах змяшчаюцца разнастайныя матэрыялы, важныя для вывучэння рэгіянальнай гісторыі: рашэнні органаў мясцовай улады, бягучая інфармацыя сацыяльна-эканамічнага характару і інш. У неафіцыйных частках газет апублікавана нямала краязнаўчых артыкулаў. Напрыклад, у сярэдзіне XIX ст. па губернскіх ведамасцях можна прасачыць змяненні коштаў прадуктаў у губернскіх цэнтрах на працягу штотыднёвых перыядаў, падрабязныя метэаралагічныя звесткі, інфармацыйныя паведамленні паліцэйскіх і судовых органаў і інш. На жаль, у фондах НББ няма поўных камплектаў гэтых газет, і таму ў электронных калекцыях маюцца лакуны. Відавочна, што НББ будзе прыкладаць намаганні па папаўненні гэтай калекцыі, пашырэнні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складу адлюстраванай перыёдыкі, што будзе яшчэ больш павышаць значэнне калекцыі для задавальнення патрэб удзельнікаў навукова-адукацыйнага працэсу ў вышэйшай школе.

Дакументы, прадстаўленыя ў калекцыях «Крыніцы па гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX стст.», «Перыядычны друк Беларусі другой паловы XVIII ст. – 1917» даступныя праз электронны каталог НББ у межах лакальнай сеткі ў будынку бібліятэкі. Бібліяграфічныя запісы такіх перыядычных выданняў змяшчаюць спасылку на электронны рэсурс. Гэта стварае магчымасць выкарыстання лічбавых копій для мінскіх студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і выкладчыкаў, але даступнасць для карыстальнікаў іншых гарадоў можа быць забяспечана праз стварэнне мультымедыйных рэсурсаў на DVD-ROM дысках і Інтэрнет-доступ з партала НББ. Прыведзеныя прыклады асобных калекцый паказваюць грунтоўнасць крыніцазнаўчага інфармацыйнага забеспячэння вывучэння і даследавання беларускай гісторыі дарэвалюцыйнага часу, пераважна XIX – пачатку XX ст.

Лічбавыя рэсурсы перыядычных выданняў дарэвалюцыйнага перыяду дапаўняюцца буйным рэсурсам сучаснай перыёдыкі – «Электронным архівам нацыянальнай перыёдыкі», які папаўняецца НББ з лістапада 2006 г. У архіве прадстаўлены найбольш значымыя газеты, часопісы, паведамленні інфармацыйных агенцтваў рэспублікі, якія рэгулярна паступаюць у бібліятэку на дагаварной аснове. Падкрэсліваючы агульную значымасць усіх перыядычных выданняў для гістарычных даследаванняў, неабходна звярнуць увагу на спецыяльныя гістарычныя выданні, па якіх карыстальнікі знаёмяцца з навуковымі артыкуламі, удасканальваюцца ў методыцы навуковай работы, знаходзяць новыя матэрыялы для семінараў і інш.

Карыстальніцкі інтэрфэйс электроннага архіва зручны і дазваляе ў межах вылучаных асноўных раздзелаў: газеты, часопісы і паведамленні інфармацыйных агенцтваў знаёміцца са спісам выданняў, выбіраць па назве, году, месяцы, нумары выдання, ці звяртацца да падшыўкі за патрэбны год. Поўныя тэксты выданняў даступныя ў PDF-фармаце.

Па стане на бягучы час карыстальнікам даступны 250 назваў беларускіх перыядычных выданняў і паведамленняў інфармацыйных агенцтваў. Важна, што значную частку з іх складаюць перыядычныя выданні, уключаныя ў Пералік Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Інструкцыяй аб парадку фарміравання пераліку навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў» (2009 г.) электронныя копіі перыядычных выданняў, уключаных у пералік ВАК, накіроўваюцца ў НББ у фармаце PDF або ў іншым фармаце, прызначаным для публічнага карыстання.

Сучасныя навуковыя перыядычныя выданні тыпу веснікаў і прац адлюстроўваюцца і ў НББ, і ў рэпазіторыях універсітэцкіх бібліятэк, напрыклад, як «Веснік БДУ. Серыя 3», дзе змяшчаюцца гістарычныя публікацыі.

Высокі ўзровень выкарыстання электроннага архіва, а таксама зацікаўленасць многіх бібліятэк у доступе да гэтага рэсурсу стымулююць НББ перавесці архіў на новую платформу для дасягнення новага ўзроўню бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання [3].

Для развіцця гістарычнай навукі выключна важным інфармацыйным рэсурсам з'яўляецца «Электронная бібліятэка дысертацый і аўтарэфератаў дысертацый Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі». Сяброўскі інтэрфэйс дазваляе рэалізаваць шырокія магчымасці навігацыі і пошуку і знаёміцца з тэкстамі патрэбнай тэматыкі і аўтараў і ў межах навуковай спецыяльнасці 07.00.02 «Айчынная гісторыя». Адзначым, што ў электронных бібліятэках універсітэтаў краіны няма рэсурсу падобнага ўзроўню.

Разам з выкарыстаннем уласных калекцый НББ, студэнты, выкладчыкі і даследчыкі беларускай гісторыі маюць магчымасць звяртацца да буйнейшых карпаратыўных паўнатэкставых рэсурсаў, у якіх прымае ўдзел Нацыянальная бібліятэка: «Залатая калекцыя Еўразіі», «Электронная бібліятэка Манускрыптаў (Manuscriptorium)», Сусветная лічбавая бібліятэка (World Digital Library), якія даступны праз Інтэрнет. Напрыклад, у раздзелах гісторыі, культуры, знакамітых людзей і іншых лічбавай «Залатой калекцыі Еўразіі» карыстальнікі могуць пазнаёміцца з выдатнымі і каштоўнымі выданнямі, якія адлюстроўваюць лёс і культуру беларусаў, у тым ліку «Статут Великого Княства Литовского» (1854), «Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии» М. О. Без-Корниловича (1855), «Кароткая гісторыя Беларусі» В. Ю. Ластоўскага (1910) і інш.

Падводзячы вынікі дзейнасці НББ па стварэнні лічбавых калекцый, трэба адзначыць, што для ўдзельнікаў навукова-адукацыйнага працэсу ў вышэйшай школе адкрыліся якасна новыя магчымасці вывучэння і навуковага пазнання крыніц гістарычнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакументальнай памяці беларускага народу, у тым ліку ў аспекце распрацоўкі новай тэматыкі, прымянення метадаў даследаванняў. І таксама звернем увагу на Інтэрнет-партал НББ, роля якога ў інфармацыйным забеспячэнні навукова-адукацыйнага працэсу няўхільна ўзрастае, і навукова-педагагічным кадрам неабходна звяртаць увагу студэнтаў на яго патэнцыял пры арганізацыі вывучэння айчыннай гісторыі. Гістарычным кафедрам, улічваючы патэнцыял НББ, мэтазгодна ўдзельнічаць у абмеркаванні адбору дакументальных крыніц, неабходных для вывучэння беларускай гісторыі.

1. *Кузьминич, Т. В.* Цифровые коллекции НББ как основа формирования контента Национальной электронной библиотеки Беларуси / Т. В. Кузьминич, Л. В. Горбачева, В. В. Пшибытко, В. И. Бричковский // Бібл. весн.: [зб. арт.] / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2011. – Вып. 3. – С. 152 –160.

2. *Кузьмініч, Т. В.* Лакальныя электронныя калекцыі як сродак стварэння крыніцазнаўчай базы гістарычных і краязнаўчых даследаванняў (на прыкладзе Памятных кніжак беларускіх губерняў) / Т. В. Кузьмініч, В. Саітава // Бібл. свет. – 2012. – № 5. – С. 19–20.

3. *Сакович, О. В.* Электронный архив национальной периодики НББ: современный этап развития / О. В. Сакович // Библиотеки и информационные ресурсы в современном мире культуры, образования и бизнеса [Электронный ресурс]. – М.: ГПНТБ России, 2012. – Рэжым доступу: http://www.gpntb.ru/win/inter-events/ crimea2012/eng/disk/113.pdf. – Дата доступу: 5.05.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ